# ФІКСАЛЬНЫЯ АЦЭНАЧНЫЯ ДЭРЫВАТЫ Ў ГАВОРКАХ МСЦІСЛАЎШЧЫНЫ (на матэрыяле “Дыялектнага слоўніка” Г.Ф. Юрчанкі)

**Урбан Вольга Валянцінаўна**
дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства установы адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

Даследаванне лексікі са значэннем ацэнкі ў беларускай дыялектнай мове на словаўтваральным узроўні дазваляе ўстанавіць асаблівасці і спецыфіку дэрывацыйных працэсаў, якія адбываюцца пры ўтварэнні субстантываў-характарыстык асобы ў беларускіх гаворках. Менавіта “невычэрпнае багацце народных гаворак – гэта ўдзячная крыніца папаўнення і абагачэння слоўнікавага складу літаратурнай мовы. Дыялектная лексіка з яе трапнасцю, дакладнасцю, гібкасцю, выразнасцю пераносных значэнняў – каштоўнейшы скарб нацыянальнай мовы” [2, с. 5]. У “Дыялектным слоўніку” Г.Ф. Юрчанкі пададзены багаты слоўны матэрыял (растлумачана значэнне 2170 слоў) з гаворак жыхароў Мсціслаўшчыны, у тым ліку і лексіка са значэннем ацэнкі, якая ўяўляе вялікую каштоўнасць для лінгвістычных даследаванняў у галіне беларусістыкі. У нашым артыкуле будуць прааналізаваны асабовыя ацэначныя дэрываты, утвораныя шляхам афіксацыі.

**Аддзеяслоўныя** субстантывы са значэннем ацэнкі ў гаворках Мсціслаўшчыны прадстаўлены разнастайнымі дэрыватамі, утворанымі шляхам далучэння да дзеяслоўных асноў матэрыяльна выражаных словаўтваральных фармантаў або шляхам нульсуфіксацыі.

Сярод усіх суб’ектыўна-ацэначных ***суфіксальных*** дэрыватаў вылучаецца група аддзеяслоўных назоўнікаў са значэннем ‘асоба-суб’ект дзеяння’, якія характарызуюць чалавека паводле схільнасці да выканання пэўнага негатыўнага дзеяння і ўтвараюцца пры дапамозе фарманта ***-л(а)***. Утваральнымі для такіх пеяратываў выступаюць асновы інфінітыва (у большасці выпадкаў) і асновы дзеясловаў цяперашняга часу: *біндзюгайла* м. і ж. ‘гультай; вісус’ ад *біндзюгацца* ‘цягацца; лодырнічаць, хадзіць без справы’; *брузла* м. і ж. ‘той, хто многа спіць’ ад *брузнуць* ‘шмат спаць’ і *брузла* м. і ж. ‘распаўнелы чалавек’ ад *брузнуць* ‘таўсцець, паўнець’; *буркала* м. і ж. ‘буркун, буркуха’ ад *буркаць*; *вабражала* м. і ж. ‘задавака, ганарлівец’ ад *вабражаць*; *жвянькала* м. і ж. ‘пляткар’ ад *жвянькаць* ‘надакучаць размовамі’. Менш пашыраны ў гаворках Мсціслаўшчыны ацэначныя дэрываты, утвораныя ад дзеяслоўных асноў пры дапамозе фармантаў ***-ун***: *лескатун* м. ‘балбатун, пустаслоў’ ад *лескатаць*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

‘балбатаць, лапатаць’; *хварсун* м. ‘фарсун’ ад *хварсіць*; ***-іл(а)/-ал(а)***: *грыміла* м. ‘буркун’ ад *грымець* ‘бурчаць, лаяцца’; *гэмзала* м. і ж. ‘неакуратны’ ад *гамзіць* ‘мяць, камячыць, кідаць дзе папала, не берагчы (адзенне, абутак)’; ***-ец***: *гулец* м. ‘гуляка’ ад *гуляць*; ***-эй***: *варажэй* м. часта іран. ‘варажбіт; той, каму варожаць’ ад *варажыць*; ***-он***: *разявон* м. і ж. ‘разявака’ ад *разявіць(цца)*; ***-лк(а)***: *тарахцелка* м. і ж. ‘балбатун; балбатуха’ ад *тарахцець*; ***-эннік***: *варэннік* м. ‘той, хто варыць (звычайна няўмела)’ ад *варыць*; ***-ышк(а)***: *трапышка* м. і ж. ‘балбатун’ ад *трапацца*; ***-анец/-энец***: *абшарпацца* – *абшарпанец* м. ‘абадранец’; *апусціцца* – *апушчэнец* м. ‘неахайны, абыякавы да сябе, да знешняга выгляду; лодар, гультай’.

***Нульсуфіксальныя*** аддзеяслоўныя субстантывы агульнага роду з канчаткам -а(-я) называюць асоб паводле дзеяння або схільнасці да пэўнага дзеяння, названага матывавальным словам, і маюць розныя ацэначныя адценні: пагардлівасці, зневажальнасці, абразлівасці, асуджэння і інш. Матывавальнымі выступаюць асновы дзеясловаў; фінальныя галосныя інфінітыўных асноў, а таксама фіналі -ва-, -ава-(-ыва-) адсякаюцца: *балабон* м. і ж. ‘балбатун, пустаслоў; балбатуха’ ад *балабоніць* ‘балбатаць, плявузгаць’; *вазголя* м. і ж. ‘маруда’ ад *вазголіць* ‘замазваць, размазваць, вымазваць’; *галуза* м. і ж. ‘неслух, свавольнік, гарэза’ ад *галузіць*; *гамза* м. і ж. ‘неакуратны’ ад *гамзіць* ‘мяць, камячыць, кідаць дзе папала, не берагчы (адзенне, абутак)’; *гламазда* м. і ж. ‘няўмека’ ад *гламаздаць* ‘няўмела рабіць (плесці, шыць)’; *зніба* м. і ж. ‘хныкала, ныцік’ ад *знібець* ‘хныкаць, ныць’; *прызмуста* м. і ж. ‘той, хто паддражнівае’ ад *прызмусіць* ‘паддражніваць’; *распуста* ж. ‘распусная жанчына’ і м. і ж. ‘свавольнік, свавольніца’ ад *распусіцца*; *скліма* м. і ж. ‘плакса; піскун, піскуха’ ад *склімець* ‘плакаць, хныкаць’; *супарат* м. ‘упарты’ ад *супаратываць* ‘паказваць нораў, супраціўляцца’; *хырля* м. і ж. ‘счахлы, змарнелы; заняпалы’ ад *хырлець* ‘чахнуць, марнець’. Нульсуфіксальнае аддзеяслоўнае словаўтварэнне з’яўляецца прадуктыўным у экспрэсіўнай лексіцы [1, с. 263] як у гаворках Мсціслаўшчыны, так і на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

**Адпрыметнікавыя *нульсуфіксальныя*** дэрываты мужчынскага роду з нулявым канчаткам і агульнага роду з канчаткам -а(-я) маюць адценні неадабрэння, пагардлівасці, грубасці і інш. і абазначаюць асоб паводле выразнай знешняй прыкметы або ўнутраных якасцей. Фіналі ўтваральных асноў прыметнікаў могуць адсякацца: *нясыты* – *несыць* м. і ж. ‘ненаедны’; *удалы* – *вудаль* м. і ж. ‘зухаваты’; *малахольный* ‘дзікаваты; дурнаваты’ – *малахол* м. ‘дзівак; дурнаваты’; *растаропны* – *растаропа* м. і ж. ‘кемлівы’; *склізкій* – *скліза* м. і ж. ‘хілае, слабае, капрызнае дзіця’; *шкарыдный* ‘задзірысты, упарты’ – *шкарыда* м. і ж. ‘задзіра; упарты’.

***Суфіксальныя*** адпрыметнікавыя ацэначныя субстантывы мужчынскага, жаночага і агульнага роду ўтвараюцца ад асноў прыметнікаў (зрэдку



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дзеепрыметнікаў) пры дапамозе суфіксаў ***-ец***: *хлепяслівый* ‘нястрыманы, нявытрыманы да яды’ – *хлепяслівец* м. ‘нястрыманы, нявытрыманы да яды’; ***-іст***: *акуратны* – *акураціст* м. ‘акуратны’; ***-ік***: *ветранный* ‘легкадумны’ – *ветраннік* ‘легкадумны’; ***-ень***: *слізкій* ‘слізкі, коўзкі’ – *склезень* м. і ж. ‘хілае, слабае, капрызнае дзіця’; ***-к(а)***: *вугнявый* ‘косназыкі, гугнявы’ – *вугняўка* ж. ‘косназыкая, гугнявая’. Названыя дэрываты маюць ацэначныя адценні неадабрэння, зневажальнасці і іроніі.

**Адсубстантыўныя** ацэначныя асабовыя дэрываты, утвораныя шляхам ***суфіксацыі***, складаюць некалькі груп:

а) фемінінатывы, назоўнікі мужчынскага і агульнага роду, утвораныя ад ацэначных назоўнікаў мужчынскага і агульнага роду пры дапамозе фармантаў ***-к(а)***: *акураціст* – *акурацістка* ж. ‘акуратная’; *апушчэнец* – *апушчэнка* ж. ‘неахайная, абыякавая да сябе, да свайго знешняга выгляду; гультайка’; *варажэй* – *варажэйка* ж. ‘варажбітка; тая, якой варожаць’; *вогір* м. ‘зух, хват, хлюст, задавака’ – *вогірка* ж.; *малахол* – *малахолка* ж. ‘дзівачка; дурнаватая’; *тумар* м. – *тумарка* ж. ‘багатырка, багацейка’; *хлепяслівец* – *хлепясліўка* ж. ‘нястрыманая, нявытрыманая да яды’; ***-іц(а)***: *бязула* м. і ж. ‘абібок, няўдаліца, гультай’ – *бязуліца* м. і ж. ‘тс’; *варэннік* – *варэнніца* ж. ‘тая, хто варыць (звычайна няўмела)’; *ветраннік* – *ветранніца* ж. ‘легкадумная’; *страмнік* – *страмніца* ж. ‘сараматніца’; ***-j(а)/-j(о)/-j(э)***: *лескатун* – *лескатуння* ж. ‘балбатуха, лапатуха’; *крыксун* – *крыксуння* ж. ‘крыкуха’; *страмата* – *страмацьё* і *страмоцце* ‘сараматнік, сараматніца’; *шалапут* – *шалапуцце* м. і ж. ‘шалапут’; ***-ун***: *крыкса* – *крыксун* м. ‘крыкун’;

б) назоўнікі мужчынскага, жаночага і агульнага роду, якія характарызуюць асоб мужчынскага і жаночага полу паводле іх падабенства або прыхільнасці да таго, што названа матывавальным словам: *камель* – *камёл**ак*** м. і ж. ‘невысокі мажны юнак або дзяўчына’; *слімак* – *слім**ень*** м. і ж. ‘тлусты, здаровы, сыты, гладкі’; *кіно* – *кін**шчык*** м. ‘аматар да кіно’; *мыццё* – *мыцц**ёха*** ж. ‘тая, што мые’;

в) адназоўнікавыя субстантывы, базавымі для якіх выступаюць невытворныя асновы неасабовых назоўнікаў: *страм* ‘сорам’ – *страм**ата*** асудж. м. і ж. ‘сараматнік, сараматніца’ і *страм**нік*** м. асудж. ‘сараматнік’;

г) назва асобы жаночага полу, утвораная ад іншага фемінінатыва: *дзяўчына* – *дзяв**уля*** ж. асудж. ‘дзяўчына’.

Адзінкавымі дэрыватамі прадстаўлены ацэначныя асабовыя субстантывы, утвораныя прэфіксальна-суфіксальным (прэфіксальна-нульсуфіксальным) спосабам: *людзі* – *нелюдзь* м. і ж. ‘вылюдак, ідыёт’; *галава* – *безгалоўе* м. і ж. ‘бесталковы, узбаламучаны чалавек’.

Такім чынам, афіксальнае словаўтварэнне ацэначных асабовых субстантываў у гаворках Мсціслаўшчыны прадстаўлена вялікай колькасцю разнастайных падтыпаў і мадэлей.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Літаратура**

1. Сцяцко, П. У. Беларускае народнае словаўтварэнне: афіксальныя назоўнікі / П. У. Сцяцко. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 320 с.
2. Юрчанка, Г. Ф. Дыялектны слоўнік (з гаворак Мсціслаўшчыны) / Г. Ф. Юрчанка. – Мінск, 1966. – 227 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова